Людзьмі звацца!
Янка Купала.

СПРАВА

№ 2
Люты
2012 г.

http://vk.com/id168308417

Выдаецца з лютага 2012 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ МАГІЛЁЎСКАГА РАЁНА

Да 130-годдзя Янкі КУПАЛЫ



Перад будучыняй

Стаім мы перад будучыняй нашай
І ўсё варожым, сочым ейны ход...
Ці ўскрэсьнем мы з душой,
упаўшай, зьвяўшай,
Каб выйсьці ў сьвет,
як нейкі здольны род...
Сягоньня мы жывём,
і ўдзень мы блудзім
Пад маскай, асьляпляючаю нас,
І што сказаць самім сабе і людзям,
Ня ведаем, ня можам, хоць і час.
Заціснуты, задушаны, як мышы
Пад жорсткім венікам, з усіх бакоў,
Шукаем, як сьляпыя, не згубіўшы
Таго свайго, што наша ад вякоў.
Пакрыўленыя колісь нашы душы
Дагэтуль выпрастаць ня ў моцы йшчэ;
Снуёмся,
ў думках зводных затануўшы,
А хтось, а штось і мучыць і пячэ.
Цябе чакаем, будучыні нейкай,
Што прыйдзеш, недзе ўсіх нас павядзеш,
І гінем марна пад чужой апекай,
Адбіўшыся ад родных вехаў, меж.
А хтось далёкі ці хтось, можа, блізкі
Засеў за наш бяседны, сытны стол
І кідае, як з ласкі, нам агрызкі,
А мы к зямлі з падзякай гнёмся ўпол.
Нявольніцтва й жабрацтва так нас зьела
І так нам высмактала з сэрца сок,
Што на'т у вочы глянуць, плюнуць сьмела
Ня сьмеем, стоптаныя на пясок.
Там чутна: Беларусь!
Там – Незалежнасьць!
А там – «Паўстань, пракляцьцем»...
Ну, а мы?
Мы ў страху... дум крутня...
разьбежнасьць...
Бяз толку крыльлем хлопаем,
як цьмы.
О так, як цьмы, як спуджаны вароны!..
І слухаем, і нюхаем тут, там:
Які павеяў вецер на загоны, –
Заходні, ўсходні, ці ад нас, ці к нам?
Аграбленыя з гонару й кашулі,
З свайго прыпыну выгнаныя вон,
Мы дзякуем, што торбы апранулі
На нас ды з нашых нітак-валакон.
З кійком жабрачым так мы, паўналеткі,
Брыдзём, паўзём у сьвет –
скрозь неўпапад.
І прысягаем, клічам Бога ў сьведкі,
Што мы – ня мы, што нехта вінават...
І так жывём, сябе саміх ня знаўшы,
Учора, сёньня лазім між канаў...
Няўжо ж бы хто й над будучыняй
нашай
Навек залом пракляты заламаў?
Няўжо нас не аб'ясьніць розум ясны
І не пакінем біцца з кута ў кут?
Няўжо кліч вечны будзе ў нас напрасны –
Кліч бураломны: вызваленьне з пут?!

1922 г.

Асвяцілі Храм



Вялікай радасцю для ўсіх праваслаўных вернікаў і жыхароў Магілёўскага раёна стала асвячэнне Храма Святой Параскевы ў Палыкавічах. У прысутнасці шматлікай паствы епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній правёў абрад асвячэння і Божую літургію. Трэба дадаць, што тут, ля святой Палыкаўскай крыніцы, раней стаяла драўляная царква Святой Параскевы, дзе часта маліўся апошні расійскі імператар Мікалай ІІ, калі ў Магілёве ў 1916 - 1917 г.г. дзейнічала Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Сяргей ПІСЬМЕННЫ.

Трэба эканоміць!



Шмат чаго цікавага можна даведацца, напрыклад, на сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Асабліва, калі абмяркоўваецца і зацвярджаецца прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэт вобласці. Што цікава, існуючыя праблемы называюцца сваімі імёнамі і не асабліва хаваюцца ды лакіруюцца. Менавіта нам было прыемна пачуць, што па даследванню Міністэрства эканомікі наш Магілёўскі раён разам з Магілёвам і Бабруйскам трапілі ў разрад *"развітых"*. Да групы раёнаў, якія *"развіваюцца"* аднесены Бялыніцкі, Бабруйскі, Быхаўскі, Касцюковіцкі. Крычаўскі, Мсціслаўскі, Асіповіцкі і Шклоўскі. *"Крызіснымі"* раёнамі названы Кіраўскі. Клімавіцкі, Краснапольскі, Круглянскі, Слаўгарадскі і Чэрыкаўскі. У самую апошнюю, *"дэпрэсіўную"*, групу трапілі Глускі, Горацкі, Дрыбінскі, Клічаўскі. Хоцімскі і Чавускі раёны.

Было адзначана, што ўзрастае датацыйнасць абласнога бюджэту - яна складае ўжо 52%, і з рэспубліканскага бюджэту вобласць атрымае больш за 4,5 трлн. рублёў датацый.

Заданне вобласці па тэмпах росту валавога рэгіянальнага прадукта на 2012 год зацверджана ў памеры 105,1 - 105,6%, і гэта негледзячы на тое, што ў 2011 г. Магілёўшчына аказалася на апошнім месцы ў краіне па тэмпах росту прамысловай вытворчасці.

Прамых замежных інвестыцый запланавана прыцягнуць у эканоміку рэгёна 104 млн. долараў. І ў гэтай сувязі прагучала нават і такое ці то ўказанне, ці то прапанова: *"Трэба шукаць нябедных землякоў за мяжой!"*

Асаблівую заклапочанасць выклікае тавараабарот: у мінулым годзе па аб'ёмах рознічнага тавараабароту гандлю і грамадскага харчавання наша вобласць была на перадапошнім месцы ў краіне.

Аб'ём расходаў па падрыхтоўцы і правядзенню "Дажынак" у Горках складае 433 млрд. рублёў, з якіх 81 млрд. выдаткоўвае рэспубліканскі бюджэт, астатняе - абласны.

"Вобласць павінна працаваць у рэжыме жорсткай эканоміі!"- такое патрабаванне выказаў старшыня аблвыканкама Пятро Руднік.

Сярод рэзерваў папаўнення абласной казны эканамісты бачаць і такія, як павышэнне ставак па падатках на маёмасць і аптымізацыю сеткі бюджэтных устаноў і колькасці занятых у бюджэтнай сферы. Пачуўшы такое, чамусьці адразу ўбачыўся велічны будынак магілёўскага Дома Саветаў і падумалася: "А можа пачнуць аптымізаваць бюджэтныя ўстановы не з сельскіх школ ды бібліятэк, а вось адсюль, дзе прорва народу ў асноўным толькі і займаецца тым, што беспярапынна штампуюцца нейкія паперы, у якіх, так мовіць, бясконцыя *"планы выканання мерапрыемстваў па рэалізацыі плана мерапрыемстваў па нарошчванню абстаноўкі"?..."* Нешта вось такое падумалася... А ўслед і другое дадалося ў галаве: "Марыць - не шкодна!".

Але хто яго ведае... Можа і здзейсняцца ружовыя мары абласных кіраўнікоў -- і знойдуцца замежна-заможныя земляки, і не будзе ніякага адмоўнага сальда, і агромністыя працэнты выработленага валавога прадукту не заваляцца ў спячку на складзе, а весела разляцяцца па ўсяму свету, назапашваючы ў магілёўскую казну вялікі залаты запас.

Дай, Божа, каб так і было!..

Антон ДУБАЛОМАЎ.

Пры фінансавай падтрымцы Магілёўскай абласной арганізацыі "Беларускае дабраахвотнае пажарнае таварыства" падведзены вынікі абласнога агляду-конкурсу "Бяспечнае дзяцінства" сярод устаноў дашкольнай адукацыі. Другое месца атрымала ўстанова адукацыі "Яслі - сад п. Усход" Магілёўскага раёна. Віншуем!

"ЧЫМ БЛІЖЭЙ ДЗЯРЖАВА ДА ПАДЗЕННЯ, ТЫМ БОЛЬШ ШМАТЛІКІЯ ЯГО ЗАКОНЫ" Тацыт.

В чём секрет долголетия?

Когда встречаешься с интересным человеком, за плечами у которого большой жизненный путь, то всегда волнуешься. Потому что всегда узнаёшь много нового - о жизни, о времени, о судьбах страны. Такая вот встреча и состоялась ясным февральским днём в деревне Петровичи с Зинаидой Леоновной Голубцовой, которая всю жизнь работала на ниве народного образования и была первой Музой нашего знаменитого земляка - известного могилёвского литератора Якова Кирилловича Усикова.

Давайте полистаем страницы этой памятной встречи...



Воспоминания...

...В деревне Антоновка во время войны открыли начальную школу, где работало 4 человека на четыре класса, в том числе и Зинаида Леоновна. Якуб Кириллович Усиков в это время работал в шести километрах от нее, в Амховской школе. Его коллега жил недалеко от Зинаиды Леоновны и неоднократно приглашал к себе в гости Якуба. Именно там и произошла первая встреча, которая стала судьбоносной.



З.Л.Голубцова

«С Яковом мы прожили 7 лет. Брак регистрировали в Чаусах в феврале или марте 1943 года, куда на телеге привёз нас его коллега. 10 августа 1944 года у нас родилась дочь Мария, Манечка.

А в самом начале войны Якуб Кириллович с друзьями Сашей Ковалёвым и Петром Денисенко ушли в партизаны. Среди партизан был предатель, и однажды отряд окружили немцы. В тот день погибли все, кроме Усикова и Денисенко... Яков ночью добрался до соседней деревни с овчинкой на ногах - оборвал рукава из овчинной шубы и смастерил. Моя двоюродная сестра, у которой муж был на фронте, дала ему ботинки. Всю ночь мы с Яшкой и Денисенко добирались до Кадино. Две недели скрывались у родителей Яшки, а затем ушли в Большую Боровку.



Я.К.Усиков

После освобождения вернулись в Кадино. Яков отправился сразу в военкомат, чтобы оформить документы на фронт, я же пошла в родные Петровичи. И начала работать в школе соседней деревни Голени, учительницей начальных классов. На три первых класса (в каждом по 23-25 человек) был только один букварь. Ночами приходилось шить для детей рабочие тетради Коллектив наш был очень дружный...»



С дочерью Марией

Лариса ПЕТРУСЁВА,
учитель Кадинской СШ.

(Заканчэнне будзе)

Гонар і слава зямлі Магілёўскай

Славутыя ураджэнцы Магілёўскага раёна

УСІКАЎ Якуб (Якаў) Кірылавіч (псеўд. Я.Кірылаў, Я.Саблін, Я.Усік, Якуб Усік) - 1919, д. Кадзіна - 1995, г. Магілёў.
Удзельнік Вялікай Айчынай вайны. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Узначальваў кафедру беларускай літаратуры Магілёўскага педінстытута.
Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар шасці кніг.
Іменем Я.Усікава названа вуліца ў г.Магілёве.

ГАРЫМ!


► 20 студзеня ў жылым доме ў в.Вялікія Бялевічы здарыўся пажар, на якім загінуў гаспадар дома. Прычына - непатушаная цыгарэта.

► 1 лютага гарэла ў в.Халмы - там апёкі 1-2 ступені атрымала гаспадыня дома. Прычына - неправільная эксплуатацыя пячнога ацяплення.

► 14 лютага ў в.Мішкаўка ў выніку пажара загінула грамадзянка. Яна прыйшла да свайго сябра адзначыць Дзень усіх закаханых. Там яны добра выпілі, а потым дружна задымілі цыгарэтамі, прычым, у ложку, куды адправіліся пасля застолля. Калі загарэлася, мужчына паспеў прачнуцца і выбегчы на вуліцу, а вось яго сяброўцы не пашчасціла.

► 19 лютага адбыўся пажар у в.Вільчыцы, загінуў сваяк гаспадыні дома. Прычына - распіццё спіртных напояў і неасцярожнасць пры паленні цыгарэт.

► 18 лютага ў цэнтры в.Качурына сярод дня загарэлася ў хаце Васіля Іванавіча Рамашкевіча, які зрабіў застолле разам са сваім суседам. Выпілі, пагаманілі "за жыццё", закурылі цыгарэткі, і, відаць, якую з тых цыгарэт не датушылі. Задрамалі - і не змаглі прачнуцца ад угарнага газу. Вось так і скончылася жыццё неблагіх людзей...



В.І.Рамашкевіч

І хочацца дадаць да гэтай апекратыўнай зводкі: людзі Будзьце пільнымі і асцярожнымі з агнём! Ён вельмі небяспечны і ніколі не даруе памылак!

Алесь СУВОРАЎ.

КРЫХУ СТАТЫСТЫКІ

Па паведамленні аддзела статыстыкі Магілёўскага раёна за студзень - лістапад 2011 г. у раёне нарадзілася 468 дзяцей, што на 4,2% больш, чым у 2010 годзе.

За пазначаны перыяд памёр 871 чалавек (+5,3%). З агульнай колькасці памерлых 23,7% склалі асобы працаздольнага ўзросту.

У раёне было зарэгістравана 295 шлюбаў (+ 20,9%) і 162 скасавання шлюбаў (+ 20%).

Міліцыя даведалася пра сябе...

Супрацоўнікі аддзела маніторынга Міністэрства унутраных спраў правялі апрос жыхароў Магілёўшчыны аб рабоце органаў унутраных спраў Магілёўскай вобласці.

Высветлілася, што ў параўнанні з 2010 г. паказчык поўнага даверу міліцыі некалькі знізіўся і саставіў 35,9% (-1,3%), яшчэ 54,4% давяраюць, але не ў поўнай меры. Толькі 8,9% рэспандэнтаў далі адмоўны адказ.

Самы высокі ўзровень поўнага даверу, больш 40%,выказалі жыхары Краснапольскага, Кіраўскага, Глускага і Чэрыкаўскага раёнаў. Акрамя таго, 68,4% апытаных грамадзян выказалі цвёрдую гатоўнасць дапамагчы міліцыі ў барацьбе са злачыннасцю.

Ветлівасць і ўважлівасць адзначылі 44,7%, прафесіяналізм - 35,5%, грубасць і бестактоўнасць - 6,7%. Стан дарожнай бяспекі ў рэгіёне як станоўчы адзначаюць 41,8% рэспандэнтаў, 9% лічаць такі стан нездавальняючым.



А ці ведаеце

Называць міліцыянераў «мусарамі» пачалі яшчэ да рэвалюцыі, таму што вышуковая (сыскная) паліцыя насіла значкі «МУС» (Московский уголовный сыск).

Запрашаем усіх жадаючых рабіць "СПРАВУ" разам з намі - выказваць свае меркаванні, паведамляць цікавыя навіны, расказваць пра набалелае. Калі што ёсць сказаць - ідзіце да нас. Калі спатрэбіцца нейкая прававая дапамога - звяртайцеся. Будзем разбірацца, і па магчымасці абавязкова дапаможам. Усе нашы каардынаты пазначаны вось тут унізе, - тэлефануйце, пішыце на электронную пошту, заходзьце да нас "вКонтакте". Мы будзем рады кожнаму вашаму візіту!

Адказны за выпуск.

"СПРАВА"
Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь.
Выданне здзяйсняецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі".

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Падпісана да друку 28.02.2012. 21.00.
Наклад 299 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

вКонтакте
http://vk.com/id168308417